✓Да 120-годдзя з дня нараджэння пісьменніка Віталя Вольскага ў НББ з **2 верасня** праходзіць выстава **«Пясняр роднага краю»**. Ён аўтар драматызаваных казак, камедыі «Несцерка», значнай колькасці краязнаўчых кніг і цікавых нарысаў, даследчык беларускай літаратуры, перакладчык, нястомны падарожнік.

Шматлікія матэрыялы экспазіцыі раскрываюць жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Сярод прадстаўленай літаратуры – створаныя паводле сюжэтаў беларускага фальклору п'есы «Цудоўная дудка», «Дзед і жораў» і самая папулярная «Несцерка», якая прынесла славу не толькі яе стваральніку, але і тэатру, і акцёрам. На выставе экспануюцца краязнаўчыя «У лясах над Бярозай», «Месяц за месяцам», «Чайкі над Нараччу», «Падарожжа па краіне беларусаў» і іншыя зборнікі. Дзякуючы В. Вольскаму на беларускай мове загучалі раман М. Кульбака «Зельманцы», а таксама сатырычная паэма І.В. Гётэ «Рэйнеке-Ліс», раман В. Брэдэля «Выпрабаванне» і іншыя творы замежных аўтараў. Бліжэй пазнаёміцца з творчасцю пачынальніка творчай дынастыі можна па 11 кастрычніка.